# Артур Вольскі «Роднае слова»

Урок беларускай літаратуры ў 4 класе

**І. В. Ларыёнава,**
настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі
Пінкавіцкай СШ імя Якуба Коласа Пінскага раёна

**Мэта:** пазнаёміць з фактамі жыцця і творчасцю беларускага пісьменніка Артура Вольскага, са зместам казкі «Роднае слова».

**Задачы:**

- ❒ узнавіць веды вучняў пра гукавыя адметнасці беларускай мовы і праблемы з яе выкарыстаннем;
- ❒ узбагачаць слоўнікавы запас лексікай з літаратурнай казкі;
- ❒ садзейнічаць развіццю чытацкіх уменняў арыентавацца ў змесце і знаходзіць адказы на пытанні па тэксце, уяўляць персанажаў, характарызаваць іх на аснове іх учынкаў, фармуляваць галоўную думку казкі;
- ❒ вучыць дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі, суадносіць іх з планам, прымяняць атрыманыя веды па маўленчым этыкеце ў паўсядзённым жыцці;
- ❒ выхоўваць пачуццё павагі да роднай мовы і свядомае імкненне гаварыць на ёй у сваім паўсядзённым жыцці.

**Абсталяванне**: мульціборд, партрэт і выстава кніг Артура Вольскага, відэаролікі «Беларуская мова», сюжэт з тэлеперадачы «Мова. Як гаворыць краіна», відэа для фізкультхвілінкі, карткі для гульні «Перакладчык»

## Ход урока

### I. Арганізацыйны момант урока

**Настаўнік.** Добры дзень! Я рада ўсіх вітаць у нашым класе. Але перш чым мы пачнём наш урок, давайце вызначым ваш настрой пры дапамозе вось

гэтай чароўнай кнігі. Вам неабходна выцягнуць з гэтай кнігі чароўную закладку і прачытаць на ей надпісы. Напісанае слова пакажа, як жа вы настроены на ўрок. *(Настаўнік падходзіць да вучняў.)*

- ✓ Добры!
- ✓ Старанны!
- ✓ Ветлівы!
- ✓ Адказны!
- ✓ Уважлівы!
- ✓ Выхаваны!
- ✓ Прылежны!
- ✓ Настойлівы!
- ✓ Добразычлівы!

Ці праўду сказала мне чароўная кніга?

А цяпер усміхніцеся адзін аднаму. Вось з такім добрым настроем пачнём наш урок – урок літаратурнага чытання.

## II. Праверка дамашняга задання

*Франтальнае апытванне з элементамі выбарачнага чытання.*

**Настаўнік.** Давайце праверым дамашняе заданне. Што вы рыхтавалі дома? Пра паходжанне якіх беларускіх слоў вы даведаліся? А чаму слова акно назвалі такім словам? Чаму дарогу называюць гасцінцам? Адкуль пайшла назва бульбы? Зачытайце радкамі з тэксту. Адкуль пайшла назва слова жыта? З дапамогай якой кнігі можна даведацца тлумачэнне значэння слова? Малайцы, вы вельмі добра справіліся з дамашнім заданнем.

## III. Моўная размінка

**Настаўнік.** А мы працягваем наш урок словамі з верша Францыска Скарыны. *(Верш на дошцы, выдзеленыя словы запісаны другім колерам.)*

Любіце кнігу,

бо яна – **крыніца мудрасці**,

**ведаў і навукі,**

**лекі для душы.**

Прачытайце выразна верш. Як вы думаеце, чаму менавіта словы Францыска Скарыны я выкарыстала да нашага ўрока? Растлумачце выдзеленыя словы. Як вы разумеце сэнс слоў крыніца мудрасці, ведаў і навукі? А чаму гавораць, што кніга – лекі для душы?

Давайце прачытаем верш ўпаўголаса, як робаты ( па скаладах), як чарапахі ( цягнем галосныя). Прачытайце верш весела, бадзера!

Зараз паглядзіце відэаролік. Звярніце ўвагу на словы, якія сустаракаюцца ў ім. І адкажыце на пытанне, чаму мова параўнаўваецца з маці. *(Прагляд відэароліка пра беларускую мову.)*

Чаму аўтар гаворыць, што мова=мама? Да чаго заклікае вас прагледжаны відэаролік? Чаму трэба любіць і шанаваць сваю мову?

У кожнага народа ёсць свае скарбы душы. Для нас адным з такіх скарбаў з'яўляецца беларуская мова. Мова дапамагае людзям жыць, працаваць, разумець адзін аднаго. Яна ўзнікла даўно ў сумеснай дзейнасці людзей і служыць сродкам зносін. Пры дапамозе мовы людзі абменьваюцца думкамі, выказваюць пажаданні, перадаюць інфармацыю. Любоў да роднай мовы нараджаецца ў душы з маленства. Гэты скарб застаецца на ўсё жыццё.

**IV. Актуалізацыя ведаў**

*Віктарына «Па старонках прачытанага».*

**Настаўнік.** Я прапаную вам адказаць на пытанні віктарыны ўважлівых чытачоў. Я вам раздам карткі з урыўкамі з твораў, якія вы вывучалі раней. Вы ўважліва прачытайце ўрывак услых, а клас паспрабуе адказаць, з якіх твораў гэты ўрывак.

А) Мой брат – хлапец геройскі,

І за яго я рад:

У беларускім войску

Пайшоў служыць мой брат.

*(Артур Вольскі «Хачу служыць», III клас.)*

Б) Раз, два, тры, чатыры.

Коцю грамаце вучылі.

Ды вурчыць ён сам сабе:

Што мне А і што мне Бэ?

Іх я нават не пад’ем.

Бо ўсё смачнае – на эМ.

*(Артур Вольскі «Коцева грамата», II клас.)*

В)) «Бой» усчаўся на двары.

Але страху – ані знаку.

Нашы хлопцы-ваяры

Смела рушылі ў атаку.

*(Артур Вольскі «Снежны бой», III клас.)*

Г) Маліны даспелыя просяцца ў жмені,

Грыбы – у кашы, бы ў загоне алені.

Вітаюць нас птушкі і дрэвы гасцінна...

Ну дзе яшчэ знойдзеш такія мясціны?

Усім на зямлі я давесці бяруся:

Няма прыгажэй ад маёй Беларусі.

*(Артур Вольскі «Няма прыгажэй», II клас.)*

Хто з’яўляецца аўтарам гэтых ўрыўкаў? Так, усе гэтыя творы напісаў Артур Вольскі.

**V. Паведамленне тэмы і мэт урока.**

**Настаўнік.** І мы працягваем сення гаворку пра наш беларускі скарб, пра нашу беларускую мову, пра яе гукавыя асаблівасці. Даведаемся, чаму трэба яе берагчы і для чаго мова патрэбна людзям. Сення на ўроку вы пазнаеміцеся з творам Артура Вольскага «Роднае слова»

**VI. Вывучэнне новага матэрыялу**

***1. Чытанне вучнямі артыкула пра пісьменніка на с. 87***

**Настаўнік.** Адкрыйце падручнікі на старонцы 87 і самастойна прачытайце звесткі пра жыццё і дзейнасць Артура Вольскага. І адкажыце, чаму яго імя звязана з беларускай мовай.

**2.** ***Гутарка па пытаннях настаўніка з элементамі выбарачнага***

***чытання***

- ✓ Што вы даведапіся пра бацьку і маці Артура Вольскага?
- ✓ За што Артур як сын быў удзячны сваім бацькам?
- ✓ Як падзеі Вялікай Айчыннай вайны адбіліся на лёсе юнака?
- ✓ Якім чынам пісьменнік працаваў на карысць беларускім дзецям?
- ✓ Чаму, на вашу думку, Артур Вольскі ўсё жыццё «гаварыў па-беларуску, прапагандаваў родную мову і нацыянальную культуру»?

***3. Дэманстрацыя партрэта і кніг Артура Вольскага***

**Настаўнік.** Звярніце ўвагу на выставу. На ей змешчаны партрэт Артура Вольскага, на паліцах стаяць кнігі, у якіх знаходзяцца творы аўтара. У кнігах вы нойдзіце казкі, вершы, апавяданні Артура Вольскага. З гэтымі творамі вы зможаце пазнаёміцца пасля ўрокаў.

**VII. Фізкультхвілінка ( паўтор дзянняў герояў з відэа пад песню «Беларусь мая, сінявокая»**

***4. Работа над літаратурнай казкай «Роднае слова»***

**Настаўнік.** Перш чым прачытаць казку, давайце звернемся да слоўніка, што змешчаны ў вашым падручніку. Словы вельмі цяжкія для ўспрымання, таму будзьце ўважлівымі.

5. ***Слоўнікавая работа***

*Тлумачэнне значэння слоў да тэксту (с. 88). (словы напісаны на дошцы)*

- ✓ Вылузнуцца – освободиться.
- ✓ Выракацца – отрицать, не признавать.
- ✓ Ганьбіць – неуважаць, оскорблять.
- ✓ Нягеглая – неудачная, непривлекательная.
- ✓ Пазычыць – одолжить.
- ✓ Тутэйшы – здешний.

**Настаўнік.** Я зараз вам прачытаю казку. Вы вазьміце простыя алоўкі і пазначайце словы, якія вам незразумелыя.

*6.* ***Выразнае чытанне казкі «Роднае слова» настаўнікам***

*Чытанне апавядання да сказа «Не горшая за суседскую і за ўсе іншыя мовы»*

7. ***Прагназаванне развязкі рубрыка «Пафантазіруйце»***

- ✓ Як вы думаеце, пра што пойдзе далей гаворка ў казцы?

Працяг чытання, супастаўленне прапанаваных варыянтаў развязкі з аўтарскай канцоўкай

- ✓ Якія незразумелыя словы вам сустрэліся ў тэксце?
- ✓ Абмен уражаннямі пасля слухання: якія эпізоды твора ў час чытання вас засмучалі? А якія радавалі?

8. ***Аналіз твора і другасны сінтэз***

✓ Якія асабліваці сваёй мовы не падабаліся людзям аднаго краю?

✓ Ці здагадаліся вы, пра якую мову ідзе гаворка ў казцы? Адказ патлумачце.

✓ А што значаць такія цікавыя словы, як дзеканне і цеканне?

✓ Ці дае аўтар назву мове, якую беларусы надумалі пазычыць ў суседзяў?

✓ Назавіце назвы моў краін-суседак Беларусі.

✓ Якая мова разам з беларуская мовай з’яўляецца дзяржаўнай?

✓ Знайдзіце ў казцы сказ, у якім адлюстравана асноўная думка.*(«І неўзабаве зразумелі, што ні адной на свеце мовай не выкажаш так дакладна свае думкі і пачуцці, як роднай»).*

**Настаўнік.** Зараз адкрыйце падручнік на с. 91 і прачытайце пытанне. У пары з суседам па парце выканайце гэтае заданне.

*Пасля парнай работы па заданні 6 вучні прыйдуць да высновы, што пункты прадстаўленага плана казкі сапраўды пераблытаны. Парадак іх павінен быць такім:*

1. Абурэнне людзей аднаго краю.
2. Надумалі пазычыць мову ў суседзяў.
3. Недарэчнасць са словам «благие».
4. Суседзі заходзіліся ад смеху.
5. Адзін стары і разумны чалавек.

6. Родная мова не горшая за суседскую.

**Настаўнік.** Якія яшчэ цікавыя думкі выклікала ў вас казка Артура Вольскага? *(Магчыма, вучні заўважаць аўтарскае асуджэнне грэблівых адносін асобных людзей да беларускай мовы і скажуць пра заклік пісьменніка шанаваць і берагчы роднае слова, цікавіцца вывучэннем і іншых моў.)* Якое слова ў тэксце гучыць аднолькава на абедзвюх мовах, але сэнс ў іх розны? *(Благія.)*

*9.* ***Гульня «Перакладчык»***

**Настаўнік.** Вельмі шмат такіх слоў, якія ў рускай і беларускай мове гучаць аднолькава, але маюць розны сэнс. Зараз адкажыце на мае пытанне і выберыце адпаведную картку. Супастаўце малюнкі, назвы якіх гучаць аднолькава.

| **Значэнне слова ў беларускай мове. Слова па-беларуску** | **Значенне слова в русском языке Слово по-русски** |
|---|---|
| 1.Свойская жывёла з доўгімі вушамі | 1. Человек, который всего боится |
| 2. Тканы выраб на падлогу, сцяну для ўцяплення і ўпрыгожвання | 2. Предмет мягкой мебели для отдых |
| 3. Апошні дзень тыдня | 4. Отрезок временн, равный 7 дням |
| 4. Свойская (ці дзікая) вадаплаўная птушка | 5. Качание судна в воде |

Ці можа здарыцца недарэчнасць з тым, хто не ведае значэння гэтых слоў у рускай і беларускай мовах?

***10. Прагляд відэароліка з перадачы «Мова. Як гаворыць краіна.»***

**Настаўнік.** А зараз прагледзіце ўрывак відэа з перадачы «Мова. Як гаворыць краіна», у якой вядучыя ездзілі па вёсках і гарадах Беларусі і збіралі словы, якія гучаць ў кожнай часцы Беларусі па-рознаму. *(Прагляд відэа «Мова. Як гаворыць краіна». (Заходняе Палессе))*

Пра якія вёскі ідзе гаворка? Якія словы вас здзівілі?

## VIII. Дамашняе заданне

Падрабязны пераказ казкі па выпраўленым плане дапаможніка. С. 88–91, пераказ па плане.

## IX. Вынік урока. Рэфлексія

**Настаўнік.** Чаму вучыць нас казка Артура Вольскага? Вы вельмі добра сёння папрацавалі на ўроку. І мне хочацца, каб кожны з вас даў абяцанне або напісаў пажаданне беларускай мове. У кожнага з вас на парце ляжыць закладка. Напішыце на ёй сваё абяцанне мове і пакладзем іх у чароўную кнігу. І з цягам часу вашыя пажаданні-абяцанні збудуцца. А чароўная кніга пакажа іх вучням другіх школ, каб паказаць, якія добрыя і працавітыя вучні жывуць і вучацца ў вёсцы Пінкавічы.

Мне хочацца скончыць урок словамі вялікага беларускага песняра, які зрабіў вялікі ўклад у развіцце беларускай мовы, які не цураўся яе, а лічыў яе самай лепшай моваў свету, у прошлым, настаўніка нашай школы…

Як вы думаеце, пра каго ідзе гаворка?

Якуб Колас: «Любіце, ведайце і шануйце мову свайго народа і ўмейце дасканала валодаць ёю».